КАНФЕРЭНЦЫЯ
НОВАЯ
БЕЛАРУСЬ 2025

Заява (дэкларацыя) дэмакратычных сіл Беларусі

# Аб дасягненні справядлівасці ў Беларусі

***Улічваючы*** працяглыя маштабныя міжнародныя злачынствы і грубыя парушэнні правоў чалавека ў Беларусі, накіраваныя супраць часткі беларускага грамадства па палітычных матывах і звязаныя з ужываннем актаў катаванняў, гвалтоўных знікненняў, незаконнага пазбаўлення волі, пераследу,

***Прымая да ўвагі*** актывізацыю практык экстратэрытарыяльнага пераследу грамадзян і грамадзянак Беларусі і этнічных беларусаў і беларусак з боку ўладаў рэжыму Аляксандра Лукашэнкі па палітычных матывах,

***Улічваючы,*** што згодна з Дакладам Групы незалежных экспертаў ААН па становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі, да прымусовага выгнання з Беларусі былі падвергнутыя да 600.000 жыхароў і жыхарак Беларусі,

***Адзначаючы*** асаблівую ўразлівасць ахвяр міжнародных злачынстваў, здзейсненых уладамі рэжыму Лукашэнкі, што апынуліся ў выгнанні,

***Вітаючы*** рэалізацыю Урадам Літоўскай Рэспублікі працэдуры па артыкуле 14 Рымскага статута аб перадачы “беларускай сітуацыі” ў Офіс Пракурора Міжнароднага крымінальнага суда,

***Звяртаючы ўвагу*** на распачатую працэдуру папярэдняга вывучэння “беларускай сітуацыі” Офісам Пракурора Міжнароднага крымінальнага суда,

### *Мы, дэмакратычныя сілы Беларусі:*

<u>Канстатуем,</u> што прымірэнне ў беларускім грамадстве магчыма толькі пасля аднаўлення правоў усіх ахвяр міжнародных злачынстваў, учыненых прадстаўнікамі і прадстаўніцамі рэжыму Лукашэнкі, і рэалізацыі правасуддзя ў дачыненні да вінаватых;

<u>Заклікаем</u> партнёраў дэмакратычных сіл Беларусі перадаваць у Офіс пракурора Міжнароднага крымінальнага суда інфармацыю аб фактах пераследу грамадзян і грамадзянак Беларусі і этнічных беларусаў і беларусак, якія знаходзяцца на іх тэрыторыі, з боку ўладаў рэжыму Лукашэнкі, а таксама аказваць любую даступную падтрымку Офісу пракурора ў гэтым пытанні;

<u>Звяртаемся</u> з просьбай аказваць усебаковую падтрымку грамадзянам і грамадзянкам Беларусі, што апынуліся ў выгнанні, а таксама этнічным беларусам і беларускам, якія падвяргаюцца экстэрытарыяльнаму пераследу з боку ўладаў рэжыму Аляксандра Лукашэнкі;

<u>Цвёрда перакананыя</u>, што дасягненне правасуддзя ў “беларускай сітуацыі” і прымірэнне ў беларускім грамадстве адпавядаюць мэтам рэгіянальнай і глабальнай бяспекі;

<u>Заклікаем</u> да стварэння міжнароднай кааліцыі дзяржаў дзеля дасягнення правасуддзя ў Беларусі.

***Заявление (декларация) демократических сил Беларуси***

О достижении правосудия в Беларуси

***Отмечая*** продолжающиеся масштабные международные преступления и грубые нарушения прав человека в Беларуси, направленные против части беларуского общества по политическим основаниям и связанные с применением актов пыток, насильственного исчезновения, незаконного лишения свободы, преследования,

***Принимая во внимание*** усиление практик экстерриториального преследования граждан и гражданок Беларуси и этнических беларусов и беларусок со стороны властей режима Александра Лукашенко по политическим основаниям,

***Учитывая,*** что согласно Докладу Группы независимых экспертов и эксперток ООН по положению в области прав человека в Беларуси принудительному изгнанию из Беларуси были подвергнуты до 600.000 жителей Беларуси,

***Отмечая*** особую уязвимость жертв международных преступлений властей режима Лукашенко, оказавшихся в изгнании,
Приветствуя реализацию Правительством Литовской Республики процедуры по статье 14 Римского Статута по передаче “беларуской ситуации” в Офис прокурора Международного уголовного суда,

***Обращая внимание*** на начатую процедуру предварительного изучение “беларусской ситуации” Офисом прокурора Международного уголовного суда,

***Мы, демократические силы Беларуси:***

Констатируем, что примирение (reconciliation) в беларусском обществе возможно только после восстановления прав всех жертв международных преступлений, совершенных представителями и представительницами режима Лукашенко, и реализации правосудия в отношение виновных;

Призываем партнеров демократических сил Беларуси передавать в Офис прокурора Международного уголовного суда информацию о фактах преследования граждан и гражданок Беларуси и этнических беларусов и беларусок, находящихся на их территории, со стороны властей режима Лукашенко, а также оказывать Офису прокурора Международного уголовного суда любую доступную поддержку по данному вопросу;

Обращаемся с просьбой оказывать всестороннюю поддержку гражданам и гражданкам Беларуси, оказавшимся в изгнании, а также этническим беларусам и беларускам, преследуемых властями режима Александра

Лукашенко экстерриториально;

Твердо убеждены, что достижение правосудия в “беларуской ситуации” и примирения в беларусском обществе соответствует целям региональной и глобальной безопасности;

Призываем к  созданию международной коалиции стран по достижению правосудия в Беларуси.